На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

№ 85 (1150)

Аўторак, 15 мая 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 100 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Надвор'е

Сёння ўдзень па краіне захаваецца пераменная воблачнасць, месцамі пераважна па паўночнай частцы — кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер паўднёва-заходні, 4—9 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ў Віцебску —+17...+19, Магілёве, Мінску — +19...+21, Гродне, Гомелі, Брэсце — +20...+22.

У наступныя двое сутак: 16-га — па паўночным захадзе, 17-га месцамі — кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер паўднёвы і паўднёва-заходні, 5—10 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с, уначы — +6...+11, удзень — +19...+24.

НАВІНЫ

На 15 паверсе — бел-чырвона-белы сцяг

Бел-чырвона-белы сцяг быў устаноўлены невядомымі 13 мая ў Брэсце. Палотнішча да 12 гадзін лунала на самым высокім будынку па вуліцы Савецкай. Сцяг быў усталяваны на апошнім паверсе 15-павярховага гатэля. Недабудаваная і ўжо паўразбураная каробка гатэля ўзвышаецца над невысокім цэнтрам горада, таму сцяг быў бачны здалёк.

Паводле звестак БелаПАН, адказнасць за ўстаноўку беларускага нацыянальнага сцяга на будынку ўзяў на сябе небезвядомы Мірон.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Міліцыя цікавіцца пісьмамі

Адказнага сакратара ўправы Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ Анатоля Крыварота ў яго кватэры наведалі супрацоўнікі Цэнтральнага РУУС Мінска. Як паведамляе прэсслужба Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ, міліцыянераў цікавіла, якая карэспандэнцыя ідзе на адрас асабістай абаненцкай скрынкі Анатоля Крыварота ў мясцовым паштовым аддзяленні. Адказны сакратар управы заявіў, што, згодна з заканадаўствам, мае права на тайну перапіскі і не разумее цікавасці супрацоўнікаў міліцыі без санкцыі пракурора. Тады міліцыянеры прапанавалі яму прайсці з імі ў РУУС. Аднак Крыварот адмовіўся зрабіць гэта. У выніку яму была выпісана позва з'явіцца ў міліцыю 14 мая.

Юрый АЛЯКСЕЕЎ.

"Багі сярпа і молата"

Новы дакументальна-публіцыстычны фільм вядомага беларускага кінарэжысёра Юрыя Хашчавацкага "Багі сярпа і молата" высока ацанілі ўдзельнікі міжнароднай канферэнцыі дакументальнага кіно INPUT, якая пад эгідай ЮНЕСКА з 30 красавіка па 5 мая праходзіла ў Кейптаўне (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка).

"Вывучыўшы тэму бальшавізму і праваслаўя, я зразумеў, што руская праваслаўная царква шмат у чым прадвызначыла з'яўленне бальшавізму", — заўважыў Хашчавацкі, гаворачы пра канцэпцыю карціны. Паводле яго слоў, і бальшавізму, і праваслаўю ўласцівая вера без разумення, а ў сістэме камуністычнай ідэалогіі прысутнічаюць усе элементы рэлігійнай дактрыны. Акрамя таго, як падкрэсліў рэжысёр, руская праваслаўная царква з'ўлялася носьбітам не веры, а ідэалогіі. "А сёння прэзідэнт Беларусі гаворыць аб праваслаўі як галоўнай рэлігіі".

Марат ГАРАВЫ.

У Магілёўскай вобласці выяўляюць наркотыкі

У Бабруйску ў кватэры 45-гадовага непрацуючага мясцовага жыхара знойдзена 15 пакетаў, у якіх знаходзілася 10 грамаў гераіну. Паводле слоў гаспадара кватэры, наркотыкі былі куплены ім у незнаёмага чалавека для асабістага ўжывання. Па факце ўзбуджана крымінальная справа, вядзецца следства.

У Клімавічах міліцыянеры пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў знайшлі ў доме ў 26-гадовага непрацуючага жыхара райцэнтра і канфіскавалі 250 мілілітраў ацэтыліраванага опію. Гэты грамадзянін быў раней судзімы за крадзеж, знаходзіцца на ўліку як наркаман.

Канстанцін УВАРАЎ.

Выстава польскага мастака Анджэя Струмілы

15 мая ў мастацкай галерэі Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта (ЕГУ) пройдзе прэзентацыя выставы графічных работ Анджэя Струмілы. Яе арганізатарамі выступілі Польскі інстытут у Мінску і мастацкая галерэя ЕГУ.

Вядомы даследчык краін Усходу і Азіі А.Струміла з'яўляецца таксама ініцыятарам і куратарам буйнога скульптурнага пленэра, які праводзіцца ў Польшчы, — "Integrart". Ён праводзіцца ў сядзібе мастака ў Мацьковай Рудзе, на беразе ракі Чорная Ханьча. У 2000 годзе прафесар А.Струміла стаў кавалерам вышэйшай узнагароды, якая даецца за дзейнасць на ніве польскай культуры, — Камандорскага крыжа адраджэння Польшчы (Polonia Restituta).

Анатоль СТРЫКУНОЎ.

Крадуць каўбасы

Трое супрацоўнікаў ведамаснай аховы Магілёўскага мясакамбіната і адзін работнік органаў унутраных спраў Магілёва былі затрыманы пры спробе крадзяжу з тэрыторыі прадпрыемства больш за 200 кілаграмаў каўбасных вырабаў.

Затрыманне праводзілі супрацоўнікі аддзела ўласнай бяспекі і аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю УУС аблвыканкама. Аперацыя была праведзена пасля атрымання адпаведнай інфармацыі ад кіраўніцтва мясакамбіната.

Канстанцін УВАРАЎ.

ТЕМА ДНЯ

Генерал КОЗЛОВСКИЙ: "ЛУКАШЕНКО ПЕРЕШЕЛ В ОППОЗИЦИЮ К БЕЛОРУССКОМУ НАРОДУ"



Никто из белорусских политиков за последние два-три месяца так не исколесил страну с севера на юг и с востока на запад, как президент общественного объединения "БелРос" — Международного фонда реабилитации здоровья бывших военнослужащих — первый министр обороны Республики Беларусь генерал Козловский. Редкий день его можно застать в Минске. Генерал ездит по городам и весям, изучая социальные проблемы бывших военнослужащих и их семей. Опыт работы в правительстве Кебича, наблюдения за действиями Лукашенко убедили — на вершине власти любят слышать только то, что радует душу ее главных носителей. А генерал хочет знать всю правду, хочет видеть жизнь без прикрас, такой, какая она есть на самом деле. Для этого надо получать живую информацию из первых рук, а не тщательно просеянную через сито малых и больших "вертикальщиков". Наблюдения, вынесенные генералом из многочисленных встреч, и стали основанием для этого интервью.

— Павел Павлович, какой настрой сейчас в глубинке, о чем с Вами говорят люди, на что жалуются, чего бы они хотели?

— Я выделил для себя четыре главные особенности. Первая — страшно протестный настрой. Вторая — люди ненавидят власть за нищету, до которой та их довела. Третья — они не могут себе простить, что в 1994 году попались на удочку краснобая и говоруна. Четвертая — все хотят перемен.

— Вы встречаетесь с людьми политически активными, которые лучше понимают ситуацию, критически ее оценивают. Насколько их подход характерен для большинства населения? Не обманываетесь ли Вы, принимая их взгляды за мнение всей страны?

— Вначале я тоже этого опасался. Но чем больше общаюсь с очень разными людьми, тем больше убеждаюсь — да, часто они обманывают. Но не меня, а власть. Это ей не говорят правду. А что остается делать? Вот живой пример. Беседую с директором одного завода. Он мне нарисовал такую безысходную ситуацию на предприятии, что просто тоскливо становится. Я спрашиваю: "А Вы об этом наверх докладываете?". Услышав вопрос, он на меня как на больного посмотрел: "Если я утром всю правду скажу, днем со мной контракт разорвут, а к вечеру в тюрьму бросят. И ничего никому не докажешь"...

Руководителей — от самого небольшого ранга до самого высокого — заставляют врать, заставляют рисовать радужные картины процветания. Откажешься играть в эту игру, выбросят и ноги о тебя вытрут. Отсюда масса приписок, сплошной обман, неприкрытая ложь. Думаете, этот стиль нравится? Понятно, нет. Но давит страх. А он заставляет ненавидеть тех, кто затянул тебя в этот порочный круг.

Ненависть и страх — вот те два главных чувства, которые переполняют сейчас большинство людей. И что характерно, чем более высокую должность в системе власти они занимают, тем сильнее эти чувства. На людях они говорят совершенно не то, что думают на самом деле, и совсем не то, что высказывают в откровенных беседах. Их легко обвинить в неискренности. Но ведь они поступают по ситуации. А она мне все больше напоминает 1994 год, когда приближенные заверяли Кебича, как сейчас Лукашенко, что в республике — полный порядок, что народ Вас (тогда Вячеслав Францевич, теперь Александр Григорьевич) обязательно поддержит на выборах. Уверен, Лукашенко в этом году ждет такое же разочарование, как Кебича семь лет тому назад. Даже зная уровень самолюбия одного и другого, Александра Григорьевича наверняка ждет большее разочарование.

— Вы заметили протестный настрой населения. В чем он проявляется?

— Никогда не думал, что люди в регионах чехвостят власть всякими словами. Они ею страшно недовольны. С местными никто не советуется при назначениях даже третьестепенной важности. Сплошь и рядом привозят каких-то котов в мешке, население этих пришельцев не знает. Но зато люди видят, как для них молниеносно возводят хоромы. Наверх толпами полезли какие-то подпевалы и подхалимы. Жаловаться на них невозможно. Обстановка в глубинке, как в самые худшие времена, когда на жалобы или вовсе нет ответа, или, что еще обиднее, их пересылают на реагирование тем, на кого жалуются. Дело дошло до того, что в ряде регионов советская бюрократия многим теперь кажется верхом демократии. Очень часто на встречах люди мне говорят: "Раньше хоть в райком можно было обратиться, а теперь никто никого не боится. Начальство что хочет, то и делает".

Такая политика, проводимая и поощряемая Лукашенко, который возомнил себя пупом земли, и вызывает протест. Правда, не все еще понимают, где корень зла. Некоторые на встречах со мной еще сомневаются: наверное, Лукашенко про это ничего не знает. Приходится объяснять, что он все прекрасно знает и понимает, но народ для него лишь материал в его собственной игре. Но подчеркну, даже те, кто еще верит Лукашенко, протестуют против такой жизни. И эта протестная волна все отчетливее набирает силу.

— Но она не может побороть нищету, о которой Вы упомянули.

— На днях присел на скамеечку на остановке, трамвая долго не было. Рядом женщина-пенсионерка. Говорит, получила сегодня пенсию, едет сахар, батон купить. А то утром встала, кефир и черный хлеб — вот и весь завтрак. И таких, к сожалению, много. Не от хорошей жизни все больше и больше людей спиваются. А как иначе, если для многих осталась одна радость в жизни — дешевое вино. Что, Лукашенко этого не видит или не понимает? Все видит, все понимает. Ему это выгодно — человек залил горе и молчит. Уж если официальная статистика, которая все считает "по-своему", и та признает, что все больше и больше людей живет за чертой бедности, то эту тему и продолжать не нужно.

— Павел Павлович, некоторые мои знакомые, которые в 1994 году поддержали Лукашенко, теперь кусают себя за локти. Неужели и в регионах так же?

— На первых своих встречах я предлагал поднять руку тем, кто на президентских выборах голосовал за Лукашенко. И каждый раз удивлялся минимальному количеству рук. Но очень скоро все стало понятно — теперь люди стесняются признаться, что семь лет тому назад они отдали свои голоса Александру Лукашенко. Этот доморощенный демагог тогда сумел так "запудрить" им мозги, что они поверили, будто он и в самом деле будет заботиться об их интересах, будет работать ради простых людей. Вспомните, сколько различных заверений он тогда раздавал, какие золотые горы обещал. Где обещанные им, вкладчикам Сбербанка, возвращенные вклады, хотя бы холодильниками и телевизорами? Еще в 1995 году говорилось, что сегодня цены повышаются в последний раз. После этого пустобрехства ценники в государственных магазинах менялись уже сотни раз.

— Может, напомните, как он клеймил коррупционеров?

— На днях мы подняли тот знаменитый доклад, который фактически открыл Лукашенко дорогу в президенты. Все конкретные лица, которых тогда депутат Лукашенко требовал немедленно отдать суду, преспокойненько работают на самых высоких и выгодных должностях. Михаил Мясникович, которого Лукашенко на встрече в КГБ громогласно назвал самым богатым человеком в Беларуси и с которым обещал немедленно разобраться, теперь его правая рука. Петра Кравченко Лукашенко "сослал"... Чрезвычайным и Полномочным Послом в Японию, первый заместитель председателя парламента Вячеслав Кузнецов, которого Лукашенко в докладе официально обвинил в махинациях с сотнями машин, проработав послом в Китае, сейчас устроился в структурах СНГ... И каждое такое назначение скреплялось подписью главы государства. Что же это, если не мощнейшее лицемерие и словоблудие? Многие об этом знают, и теперь им стыдно признаться, что их провели, как воробьев на мякине.

— Вы говорите также, что многие хотят перемен...

— Не многие, а все. Теперь уже все видят, что их ведут в тупик. И никакие обещания властей больше не воспринимаются. Вспомните, Лукашенко несколько раз говорил, что к осени поднимет среднюю месячную зарплату до 100 долларов. При нынешней нищете такая перспектива должна была восприниматься однозначно — как приближающееся счастье и искренняя забота. Но послушайте, что говорят об этом люди. Мнение одно — это повышение всем боком вылезет. Оно еще и близко не наступило, а цены на продукты и товары уже поползли вверх. А представьте, что будет, когда резко возрастут цены на жилье, свет, воду, телефон, другие услуги! И это обязательно случится. Ибо нынешняя верхушка власти, которая определяет всю политику, неспособна действовать иначе. Лукашенко и его ближайшее окружение пришли к власти, когда уровень жизни в Беларуси был лучше, чем у литовцев и поляков. А посмотрите, как зажиточно начинают жить наши соседи. Россия, которую тот же Лукашенко вечно критиковал, выходит из "штопора". Если раньше Беларусь кормила многие российские города, то теперь они заваливают наши прилавки не такими дорогими, как наши, продуктами. Дошло до того, что в Могилев и Витебск хлеб уже привозят из России. Люди же не слепые.

— Коль Вы уже вспомнили про 100 долларов, то не могу не сказать, что эта идея принадлежит оппозиции. Ее автор — Геннадий Дмитриевич Карпенко. Только вся разница в том, что по замыслу покойного зарплата должна была возрасти при сохранении старых цен. А это, согласитесь, принципиальнейшая разница.

— Я с вами согласен. Но одну вещь также считаю принципиально важнейшей и очень хочу ее уточнить. Тогда тот же Геннадий Дмитриевич Карпенко и другие умные люди были действительно в оппозиции. Сейчас ситуация, на мой взгляд, изменилась в корне. Неумелый руководитель, возомнивший себя "батькой", всезнайкой, человеком, который уже и Бога за бороду держит, довел народ до ручки. Ведь только при нем в Беларуси стало умирать людей больше, чем рождаться. А ведь наша Беларусь не замкнулась, не отгородилась границами, она охотно принимает к себе жителей некоторых бывших советских республик. Но даже это не помогает. Я думаю, что такой политикой Лукашенко противопоставил себя всему народу. Сегодня он уже перешел в оппозицию к населению Беларуси.

И если он сейчас этого не понимает или делает вид, что не понимает, то результаты президентских выборов быстро расставят точки над "i". Я убежден — если при подсчете голосов не будет фальсификации, то Лукашенко неизбежно проиграет. Не буду скрывать, во время последних поездок я много разговаривал с членами избирательных комиссий. Сейчас они в очень непростом положении. С одной стороны, они боятся не выполнить заказ властей. С другой, понимают, от их совести зависит судьба Беларуси. Надо сделать все, чтобы их не искусили и не запугали. И это возможно. Если мы все объединимся, то и фальсификации не допустим. И тогда мы очень скоро станем жить в нормальном государстве, где каждый будет получать столько, сколько он честно заработал.

С Павлом КОЗЛОВСКИМ беседовал

Владимир ГЛОД.

МІНСКАМУ ТРАКТАРНАМУ — 55!

У ВАСЬМЁРЦЫ "КРУТЫХ" СУСВЕТНЫХ ЭКСПАРЦЁРАЎ



Усё-такі ёсць у нас выдатныя заводы. Ёсць першакласныя інжынеры і рабочыя. Доказ таму — дасягненні мінскіх трактаразаводцаў, якія 29 мая адзначаць 55-годдзе свайго прадпрыемства. Давайце напярэдадні гэтай падзеі акінем позіркам пройдзены імі шлях і паглядзім, як працуе праслаўлены калектыў у цяперашніх, вельмі няпростых умовах.

Мінскі трактарны развіваўся хуткімі тэмпамі. 5 лістапада 1972 года з галоўнага канвеера сышоў мільённы трактар "Беларус", 24 сакавіка 1984 года — двухмільённы, а 8 чэрвеня 1995 года — трохмільённы. За мінулыя 55 гадоў выпушчана 3 мільёны 150 тысяч машын. З іх больш за паўмільёна пастаўлена на экспарт у 124 краіны свету.

Цяпер магутнасці аб'яднання "Мінскі трактарны завод" разлічаны на выпуск 50 тысяч трактароў у год. Тут вырабляюцца "сталёвыя коні" 48 базавых мадыфікацый, а таксама 5 мадэляў камунальных і шахтавых машын, розных адзінак тэхнікі для лясной прамысловасці. Аб'яднанне не толькі распрацоўвае і вырабляе першакласныя трактары, але і арганізуе іх сервіснае абслугоўванне, пастаўляе запчасткі.

На сусветным рынку кожны 12-ы трактар — наш, беларускі. Цяпер у свеце каля сотні вытворцаў такой тэхнікі. Але толькі восем з іх забяспечваюць 96% агульнага аб'ёму сусветнага рынку збыту. Дык вось, вытворчае аб'яднанне "Мінскі трактарны завод" уваходзіць у гэтую крутую васьмёрку. На МТЗ прыходзіцца да 60% аб'ёму выпуску трактароў у СНД і каля 8% — сусветнага рынку.

Нягледзячы на высокую канкурэнцыю, мінскія трактары і цяпер адгружаюцца ў 44 краіны свету. Летась завод атрымаў 262,7 мільёна долараў выручкі ад знешняга гандлю. Буйнымі пакупнікамі беларускіх трактароў з'яўляюцца Германія, ЗША, Егіпет, Францыя, Канада, Грэцыя, Венгрыя... На міжнародных выставах сельскагаспадарчай тэхнікі мінскія трактары адзначаны 29 залатымі, 2 сярэбранымі і адным бронзавым медалямі.

МТЗ — першы ў свеце і пакуль адзіны ў СНД вытворца трактароў, які пацвердзіў адпаведнасць сваіх новых мадэляў усім стандартам Еўрасаюза, выйграў шэраг міжнародных тэндэраў на пастаўку машын. У красавіку мінулага года заводу выдадзен сертыфікат аб тым, што яго сістэма якасці адпавядае патрабаванням міжнароднага стандарту ІСО 9001.

Такія вышыні даюцца няпроста. Каб іх заваёўваць, давялося адбудаваць такія сучасныя вытворчасці, як ліцейная, кавальская, тэрмічная, прэсавая, зварачная, механаапрацоўчая, інструментальная, спецыяльных пакрыццяў, магутны выпрабавальны цэнтр з трэкамі і палігонамі.

Пачынаючы з 1991 года, МТЗ стварае свае акцыянерныя таварыствы і сумесныя прадпрыемствы. Цяпер дзейнічае 12 такіх прадпрыемстваў у далёкім замежжы і 10 — у краінах СНД. Пабудаваны заводы па зборцы мінскіх трактароў у Эфіопіі, Егіпце, Пакістане, Мексіцы, В'етнаме, Балгарыі, Польшчы, Румыніі, Расіі, Украіне, Казахстане, Азербайджане. Вядуцца перамовы па іх стварэнні ў Югаславіі, Сірыі, на Кубе.

Вялікая ўвага надаецца рэалізацыі сацыяльных праграм. Сёння МТЗ, бадай, адзіны з нямногіх у Беларусі, які захаваў усю сваю сацыяльную структуру. На балансе завода — 21 дзіцячая дашкольная ўстанова, 9 інтэрнатаў, 55 жылых дамоў, паліклініка на 850 наведванняў у змену, санаторый-прафілакторый, пансіянат "Рудня", база адпачынку "Вяча", дзіцячы аздараўленчы лагер "Беларусь", другі па велічыні ў сталіцы стадыён "Трактар", басейн, Палац культуры, Дом фізкультуры, сетка прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

Нягледзячы на вялікія цяжкасці, Мінскі трактарны крочыць наперад. А калі б яшчэ гэтаму калектыву ды стварылі ў дзяржаве больш-менш спрыяльныя ўмовы...

Алесь ДРАБЧУК.

ТОЧКА ЗРЕНІЯ

ЗА СЕМЬ ЛЕТ ГОСУДАРСТВО РАССТРЕЛЯЛО 126 ЧЕЛОВЕК

Беларусь — единственное государство в Европе, в котором не только применяется смертная казнь, но даже не делается попыток в направлении ее отмены.

Об этом шел разговор Минске на международном семинаре, организованном при содействии Совета Европы Белорусским Республиканским общественным объединением "Правовая инициатива".

В 1989—1993 годах (парламентская форма правления) при трех главах государства: Н.Дементее, С.Шушкевиче, М.Грибе к высшей мере наказания ежегодно приговаривали в пределах 20 человек.

Переход к президентской форме правления привел Беларусь к резкому скачку смертных приговоров — 47 в 1998 году. 11 человек приговорены к смертной казни уже в 2001 году.

Особняком за годы президентского правления стоит лишь 1996 год, число смертных приговоров в котором снизилось более чем на 20 процентов. С января по ноябрь того года действовал Верховный Совет 13-го созыва, который был самостоятелен в законотворческой деятельности, и существовала Контрольная палата парламента, наделенная правом контроля за президентом и подчиненными ему структурами.

А.Лукашенко, претендующий в 2001 году к избранию на третий президентский срок, за предыдущие два срока пребывания в этой должности не помиловал ни одного человека. По данным, приведенным на семинаре, за годы его правления расстреляно 126 человек.

Снижение количества смертных приговоров в 1999—2000 годах вряд ли стоит воспринимать как намерение первого президента приблизиться к общеевропейским стандартам. Во-первых, расстреливали в эти годы в два—три раза больше преступников, чем приговаривали их к высшей мере. Во-вторых, А.Лукашенко взамен расстрелов ввел пожизненное тюремное заключение и лишение свободы на срок от 15 до 25 лет. Вместе с приговоренными к расстрелу это составило в 1999 году 279, а в 2000-м — 251 человек.

Мужчины, приговоренные к пожизненному тюремному заключению, влачат жалкое полуголодное существование. Им разрешается истратить лишь три МЗП в месяц. Но 17 тысяч рублей не хватает даже на предметы первой необходимости: сигареты, спички, туалетную бумагу, зубную пасту...

В свете этого не удивляли приведенные на семинаре лидером белорусского "Яблока" Ольгой Абрамовой факты жестоких самоубийств приговоренных к пожизненному заключению — жить в таких условиях невыносимо.

Приговор выносится именем Республики Беларусь, то есть именем народа. И потому смертная казнь объективно ведет к ожесточению общества. Смертная казнь не является наказанием за содеянное. Лишение преступника свободы имеет конечной целью его раскаяние и исправление. Однако смертная казнь — это не исправление, а мщение, что в принципе противоречит нашим христианским ценностям.

Адвокат Валерий Ерчак, советник Белорусского Экзархата, привел на семинаре факт: приговоренный к смертной казни вынужден был выколоть себе глаза, чтобы добиться прихода к нему священника. Но и после этого смертнику пришлось исповедоваться в наручниках при надзирателе.

По инструкции все правильно, а по христианской морали?

Валерий ЩУКИН, правозащитник, БХК.

ХОЧУ СКАЗАТЬ

Как меня не избрали на Всебелорусское собрание

У нас в школе было проведено собрание по выдвижению уполномоченных на районное собрание. Наряду с директором школы коллектив избрал и меня.

Задолго до начала районного собрания играл духовой оркестр. Собрание началось с концерта художественной самодеятельности аж на 45 минут (в рабочее время!) — как было сказано, чтобы мы "стали добрее")... Затем, по давней советской традиции — доклад о том, что все у нас в государстве и районе хорошо, а те трудности, которые иногда встречаются, — временные, и в течение "следующего срока 2001—2005 гг" (видимо, имелся в виду новый срок правления Лукашенко) будут безусловно ликвидированы.

Далее, естественно, шли выступления. Слово предоставлялось всевозможным начальникам, которые развивали теорию докладчика о "хорошей жизни" и "временных трудностях". Естественно, слыша такие речи, я еще более укрепился во мнении, что надо сказать правду, как она есть.

Я заявил, что в нарушение Конституции в стране полностью монополизированы средства массовой информации, а посему невозможно услышать о реальном положении вещей. О самом же Лукашенко, в связи с известным законом "О защите чести и достоинства президента", вообще слова критического сказать нельзя, словно он не простой смертный, способный на ошибки.

А как живет наша интеллигенция? Это я постарался раскрыть на своем личном примере. К 40 годам (я в свое время закончил с отличием вуз, отслужил в армии, работал беспрерывно более 15 лет на педагогической ниве), имея высшую категорию, а живу в общежитии, без всякой надежды на получение квартиры при каких-то, без вычетов, 60 тысячах "зайчиков". И это нормально? А начинающий учитель имеет ставку всего 40 тысяч в месяц, на которые и просуществовать нельзя. И это — после всех лукашенковских повышений бюджетникам, да еще с учетом премиальных выплат.

Естественно, мое выступление прозвучало диссонансом на собрании. Но поскольку я высказал не только собственное мнение, то посчитал, что его должны услышать и с высоких трибун. Поэтому и предложил президиуму включить меня в список для голосования на избрание делегатом на II Всебелорусское народное собрание.

Вот здесь и началось самое интересное — "расцвет демократии". Как принято на таких сборищах, представитель "от народа" доложил, что квота от района уже заполнена, и зачитал заранее заготовленный список, где значился и житель г.Витебска (видимо, своих "достойных" не хватило). Меня и тех, кто меня поддержал, просто "не слышали". Было проведено открытое голосование. Результаты, конечно же, ясны.

Вот это демократия!

На этом мои хождения в демократию по-белорусски закончились. Боюсь одного, что мое "хулиганство" дорого обойдется директору нашей школы.

Так что, скорее всего, в Новолукомле скоро появится не один, а двое новых безработных...

Михаил КАПУСТО.

Народная Воля 15 МАЯ 2001 г.

РЭХА

Вярніце закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы

У свой час, калі Вярхоўны Савет 12-га склікання, насуперак супраціўленню антыбеларускіх, антыдэмакратычных сіл прыняў закон аб дзяржаўнасці адзінай беларускай мовы, было відавочна: тое сталася магчымым дзякуючы аўтарытэтнаму ўплыву на тагачасную грамадскую думку вядомых дзеячаў нацыянальнай культуры. Сярод іх быў, безумоўна, і шаноўны прафесар Леанід Лыч, чыё паслядоўнае змаганне за жыццё і росквіт роднага Слова варта глыбокай удзячнасці і павагі.

І вось чытаю апошні артыкул Леаніда Міхайлавіча ў "Народнай волі" пад назвай "Мову — на дзяржаўны п'едэстал". У ім — боль і трывога за лёс нашай мовы, амаль цалкам выціснутай з усіх сфер жыцця, роздум аб шляхах яе адраджэння. Нельга не пагадзіцца з аўтарам: быць абыякавым да гібелі таго, што атаясамліваецца з душой народа, — нельга. Але вось што тычыцца шляхоў...

У дзяржаве, у якой мы сёння жывём, увасабленне разумных напрацовак па ўзвядзенні роднай мовы на п'едэстал, на маю думку, немагчыма. У згаданым мной законе ўсё было прадугледжана: і меры, і тэрміны, каб роднае слова сталася патрэбным народу і гучала паўсюдна, адухоўлівала наша жыццё. І тое пачынала ўвачавідкі пакрысе рэалізоўвацца напачатку 90-х. Але з прыходам да ўлады А.Лукашэнкі з яго прарасійскай палітыкай узважаны і жыццёва неабходны закон быў адменены, а на дзяржаўны п'едэстал узведзена палітыка шалёнай русіфікацыі. Пра якія ж планы і праграмы ратавання беларускасці можна сёння марыць, калі кіраўнік беларускай дзяржавы сцвярджае: "Так мы же русские!" — і дзейнічае ў гэтым накірунку?

Паважаны Леанід Міхайлавіч! На маю думку, ніякіх дадатковых мер і метадаў для аднаўлення жыццядзейнасці роднай мовы ў Беларусі прыдумваць не трэба. Трэба толькі вярнуць раней прыняты Закон аб дзяржаўнасці адзінай беларускай мовы, і ўсё стане на свае месцы. Праўда, трэба яшчэ з Беларусі расійскай стварыць Беларусь беларускую, і тады не толькі мова адродзіцца, а ўся краіна. Вось дзеля гэтага трэба нам усім рупіцца, і перш за ўсё дбаць пра суверэнітэт дзяржавы і лёс самой нацыі. Тады і мове будзе добра.

Віктар СКАРАХОД,
ветэран вайны і працы.
Мінск.

Выкраданне душы

"Сапраўднай любові да сваёй краіны нельга ўявіць без любові да сваёй мовы. Чалавек, раўнадушны да сваёй мовы, — дзікун. Ён шкодны па самой сваёй сутнасці. Таму што яго абыякавасць да мовы тлумачыцца поўнай абыякавасцю да мінулага, цяперашняга і будучага свайго народа". Так лічыў выдатны рускі пісьменнік Канстанцін Паўстоўскі, і з ім немагчыма не пагадзіцца.

На жаль, значная колькасць грамадзян Беларусі не разумее ўсю шкоду русіфікацыі. Яны разважаюць прыкладна так: "Какая разница, как называется колбаса, лишь бы она была". Але ў краіне, грамадзянам якой "нет разницы", што тут адбываецца, не будзе ні каўбасы па кішэні кожнаму, ні іншых даброт.

І царскія, і савецкія ўлады заўсёды імкнуліся даказаць, што Беларусь — гэта частка Расіі. А каб такое выглядала праўдападобным, вынішчалася ўсялякая адметнасць, самабытнасць "тутэйшых", усё мясцовае замянялася рускім. Такім чынам стваралася ідэалагічная база для інкарпарацыі нашай краіны ў склад Расіі.

Галоўная небяспека русіфікацыі ў тым, што яна ў перспектыве цягне за сабой тэрытарыяльныя, эканамічныя і палітычныя прэтэнзіі суседняй дзяржавы на гаспадаранне ў нашым беларускім доме. Практычна русіфікацыя — гэта ўдушэнне, вынішчэнне Беларусі, а не нейкае там вузкае "моўнае пытанне". Схема тут празрыстая: руская мова цалкам выцясняе беларускую, а Беларусь аб'яўляецца часткай Расіі з усімі наступствамі гэтага. Такім чынам, чужая мова — гэта этап у ланцужку закабалення нашай краіны, страты яе самастойнасці. Выкраданне мовы — гэта выкраданне душы народа.

Немагчыма аспрэчваць факты дыскрымінацыі беларусаў на сваёй этнічнай зямлі. Гэта рэальнасць. Значна ўрэзана магчымасць чытаць беларускую літаратуру — яна выдаецца мізэрнымі накладамі. У краіне няма сапраўды беларускага тэлебачання. На БТ абсалютная большасць перадач гучыць па-руску, ідзе прапаганда расійскай імперскай ідэі, шальмаванне нацыянальнай інтэлігенцыі, перш за ўсё Васіля Быкава — гонара і сумлення нашага народа.

Няма ў нас і беларускага кіно. Студыя "Беларусьфільм" агучвае свае стужкі па-руску. Зачыняюцца беларускія садкі і школы, няма ніводнай ВНУ з выкладаннем па-беларуску. Вядзецца свядомае, мэтанакіраванае вынішчэнне нацыянальнай культурнай спадчыны...

Сучасныя ўлады апраўдваюць русіфікацыю "волевыяўленнем народа". Але спасылкі на такое волевыяўленне ва ўмовах несвабоды гучаць як славаблудства, крывадушнасць, цынічны фарс. Бо патрэбнае ўладам "волевыяўленне" фарміравалася на працягу ўсяго расійскага каланіяльнага панавання на Беларусі, асабліва ў савецкія часы. І цяпер у руках русіфікатараў усе дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Абаронцы ж беларушчыны іх не маюць. Большасць насельніцтва пазбаўлена магчымасці атрымліваць праўдзівую інфармацыю.

Варварства ў дачыненні да беларускай культуры я не звязваю з рускім народам. Такое разбурэнне праводзяць мясцовыя кіраўнікі-калабаранты, каб дагадзіць сваім крамлёўскім гаспадарам.

Аркадзь ГАЛАЙ,
рабочы.
Мінск.

РАКУРС

Разве мы предатели?

Как гражданин Республики Беларусь, неоднократно участвовавший в выборах и референдумах, никогда не видел в бюллетенях референдума вопроса о моем согласии объединения моей страны с Россией. В то время никто не подозревал того, что вопрос об обычной экономической интеграции с Россией будут выдавать за одобрение слияния наших стран, или, другими словами, "добро" на исчезновение моей страны Беларуси. Если это так, то нас, граждан Республики Беларусь, по-крупному подставили, так как автоматически мы стали предателями своей Родины — Беларуси. Кто это организовал?! Подумайте!

Возможно, Лукашенко забыл об этом или полагает, что и мы, граждане Республики Беларусь, участвовавшие в референдуме, забыли это?

Выступая в Российской Госдуме накануне Нового года, Лукашенко в очередной раз рассказал неправду о том, что народ Беларуси одобрил такое объединение на референдуме. Видимо, он далек от реалий сегодняшнего дня и еще дальше от понимания того, что народ давно понял "достоинство" слова и дела А.Г., и лимит доверия к нему истощился.

Подумать только, кучка нелегитимных и бесправных деятелей во главе со "всенародноизбранным", с моей точки зрения, весьма типично напоминает стаю пиратов, которые захватили судно в международных водах и чинят там беспредел. Об этом знают все, но никто в мировом сообществе на это не реагирует, полагая, что со временем стая пиратов образумится. Нет, эти не образумятся. Это не та кучка!

Предлагаю: в подобных ситуациях, когда президент и парламент нелегитимны, а, вопреки воле народа, замышляют противоправную деятельность властей по судьбоносным вопросам жизни государства, в частности, в Беларуси, управление такой страной должно переходить под эгиду ООН, ОБСЕ.

Н.И.,
избиратель, пенсионер.



Мікалай Аляксандравіч НОВІК жыве ў вёсцы Хорава Пружанскага раёна. Сорак год ён працаваў сельскім настаўнікам! Сапраўдным настаўнікам, як кажуць яго былыя выхаванцы двух пакаленняў, бо давялося Мікалаю Аляксандравічу вучыць дзяцей сваіх першых вучняў. Потым выйшаў на пенсію. І зноў знайшоў сябе. Стаў малаказборшчыкам. На гэтай працы ён ужо адзінаццаць год.

Фота Рамана КАБЯКА, БелТА.

"ТЫШЧУ ГОД НА КАЛЕНКАХ..."

Фрагменты правінцыяльнага жыцця

Завод

Ён стаіць на выездзе з багатай, прыгожай вёскі, кантрастуючы з ёй чорнымі пустымі вокамі вакон. Калісьці тут "пяклі" цэглу. Завод — гэта, канешне, занадта гучна. Хутчэй заводзік, але цэглу ён пастаўляў спраўна, даваў работу навакольнаму народу.

Некалі мы тут праходзілі школьную вытворчую практыку. Я, адным словам, памятаю яго другім: ажыўленым, шматлюдным і даволі гарачым (ад печак). Потым яго закрылі. Вось ён ціхі і пусты. Я праходзіў міма — там толькі корпаліся, нешта адкручваючы, двое пахмурных дзецюкоў распаўсюджанага зараз тыпу: нешта сярэдняе паміж проста п'яніцам і ўжо бамжом. Адкручвалі, ясная справа, каб потым прадаць і прапіць. Зусім магчыма, дзецюкі тут некалі працавалі.

Дык што здарылася? А нічога: заводзік стаў ахвярай эканамічнага спаду. Не тое што цэгла ўжо нікому не патрэбна, а — няма за што яе купляць. Заказчыкамі былі пераважна прадпрыемствы і гаспадаркі раёна. Але яны даўно нічога не будуюць, нават не рамантуюць тое, што ёсць.

Чалавека, які б удыхнуў жыццё ў мёртвы камень, не знайшлося. І не магло знайсціся. З 1994 года такіх людзей планамерна знішчаюць. Дзякуй Богу, пакуль не фізічна. Ідэя, як заўсёды, вельмі простая і зразумелая: я жабрак, ты жабрак, мы жабракі. А гэтаму, які не жабрак, мы завод не прададзім. Няхай лепш разбурыцца. Што і адбылося. Заводзік стаіць пусты і разрабаваны ўшчэнт. Улада свайго дабілася.

Мужыкі і бабы

У гэту вёску я трапіў пад вечар, дзесьці а шостай гадзіне. Калгаснікі і калгасніцы ішлі з работы. Яны расцягнуліся на некалькі дзесяткаў метраў. Ішлі нетаропка, цяжкавата. Мужыкі і бабы.

Нічога незвычайнага. Але штосьці спыняла. Нейкая дэталь, з першага погляду няўлоўная. Так мы і ішлі: яны наперадзе, я ззаду. У пошуках гэтай дэталі я нават спыніўся, нават вочы заплюшчыў. Адкрыў — і ўсё зразумеў.

Усе бабы, як адна, былі мажныя, шырокай косткі, як гаворыцца, метр на метр. Ну, а мужыкі, адпаведна, таксама як адзін, хударлявыя, худасочныя, сухія і спітыя.

Жывая ілюстрацыя да нашай звілістай гісторыі. У гэтай гісторыі вынішчалі найперш самых лепшых, моцных, жыццяздольных і проста здольных мужыкоў. Альбо ў войнах, альбо ў лагерах, калі войнаў не здаралася. А лепшыя бабы заставаліся адны. Адпаведна, і нараджаць яны былі вымушаны (супраць прыроды не папрэш) не ад лепшых, а ад тых, што ёсць. А былі — худасочныя. Што магло ад такіх з'явіцца?

З'явіліся такія, якія выбралі гэткае жыццё і такога прэзідэнта. Хаця правілаў без выключэнняў не бывае. І чым больш выключэнняў, тым большая верагоднасць, што нацыя не скончыцца. І мы таму пацвярджэнне. Пакуль жывое...

Дарога

Аўтобусы цяпер ходзяць па гэтай дарозе на Добруш два разы на тыдзень. Так што заставалася адно выйсце: ехаць аўтастопам. Падняць руку і чакаць.

Я стаяў паўгадзіны. Некалі машыны сноўгалі тут кожную хвіліну. Трактароў на дарозе было больш, чым легкавікоў. Малымі мы тут каталіся на веласіпедах, і гэта было даволі небяспечна. Паабапал былі калгасныя палі. Яны і цяпер калгасныя. Толькі трактар на іх такая ж рэдкасць, як, скажам, насарог. У трактароў няма гаручага. А ў калгаса — грошай на яго.

У выніку дарога пустая. Тут ціха і сумна. Па гэтай дарозе нас вазілі на бульбу. А на гэтых палях мы яе збіралі. А вось у тым ракітніку мы знаходзілі чырвонагаловікі. А да гэтай вёскі спаборнічалі на веласіпедах — хто хутчэй...

А потым я спыніў малакавоз. Малакавозы тут таксама ездзяць рэдка: не стала малака. Малады мужык-вадзіцель быў чымсьці раззлаваны:

— Маць тваю, зноў паўпусты еду...

За дзесяць кіламетраў дарогі мы не сустрэлі нікога.

Звон слоіка

Хіт сённяшняга сезона — слоікі. Іх вязуць з Украіны сотнямі і тысячамі. Слоікі проста выдатныя: на 800 грамаў, з разьбою і накрыўкай. Асалода для гаспадыні. Калі трапляеш у дызель, што ідзе на Гомель, чуеш ціхі, нібы падземны, звон. Слоікі ў цэлафане стаяць штабялямі.

Іх прывязуць у горад, прададуць. На атрыманыя грошы купяць веласіпеды. Потым веласіпеды прывязуць дадому, ва Украіну, прададуць і будуць мець "навар". Аперацыя няхітрая. Самая, можна сказаць, распаўсюджаная на прасторах СНД і ў бліжэйшым замежжы. Прадаць—купіць—прадаць.

Украінцы ездзяць да нас, як на работу, кожны дзень. Часам здаецца, што бачыш знаёмыя твары. Міжволі думкі пачынаюць развівацца ў звыклым накірунку. Мы бедныя (мы нічога ва Украіну не возім — няма чаго), але яны? Чаго ім нестае? Нагадваю разважанні ўкраінскага вучонага-аграрніка на адным міжнародным семінары: адна Адэская вобласць магла б пракарміць Еўропу. Ён даказаў гэта з лічбамі. Чаго ж яны да нас едуць?

Відаць, само па сабе прыроднае багацце нічога не вырашае? Патрэбна яшчэ штосьці? Што? Магчымасць распараджацца сабою і сваёй працай незалежна да чыёйсьці волі. Калі гэтага няма, то і самы багаты ў свеце чарназём — проста зямля.

Мы бедныя, яны багатыя, а сёрбаем з аднаго карыта.

Зямля без волі

Размова з маладой жанчынай у адным з саўгасаў. Яна, здаецца, эканаміст. Скончыла універсітэт, мела выгадную работу ў фірме, але бацькі засталіся адны — вярнулася дадому. Гутарылі мы пра зямлю.

— Выйдзеш ранкам на агарод, глянеш — Божа мой! Што з гэтым рабіць? 45 сотак, а нас трое: я, муж ды малая дачка...

— Адмаўляйцеся.

— Нельга! Не так зразумеюць... Вёска ж. Дый жывёлу трымаем.

— Цяпер можна да гектара браць. Шмат хто ў вас ўзяў?

— А вы прайдзіце па вёсцы, спытайце. Ніхто не ўзяў, ніводзін чалавек!

— Чаму, як вы думаеце?

— А што тут думаць? Паспрабуйце столькі зямлі апрацаваць уручную. Мы ж, як і тышчу год таму, на каленках поўзаем!

Вось і ўсе сакрэты. Вышэй носа чалавек скакаць не хоча і не можа. Так што і гэты рэсурс выпрацаваны. А так было зручна: ні крэдытаў, ні машын, ні "хіміі" — у асабістую гаспадарку ўкладваць нічога не трэба. Дай толькі кавалак зямлі. А народ сам сябе пракорміць. Праўда, не больш таго.

Далей — "мёртвая кропка". Далей народ пальцам не паварушыць, бо ён не дурны, народ, і разумее, што зямля без волі — боты без абцасаў.

Канкурэнцыя

Апошнія гады ў беларускім пасёлку назіраецца камерцыйнае ажыўленне. Сталі прывычнымі некалькі чалавек, што сядзяць у цэнтры і гандлююць усялякай драбязой. Але сёння сітуацыю вызначаюць не яны. З'явіліся больш сур'ёзныя людзі.

Напрыклад, былы інспектар АБЭПа. Ён прыязджае з Добруша 3—4 разы на тыдзень. Асартымент у яго самы разнастайны: ад ківі і бананаў да макаронаў і круп. Вестка аб яго прыездзе аблятае пасёлак хутка і праз паўгадзіны — чарга даволі доўгая.

Абэпавец працуе ўмела, хутка і ветліва. У яго тавар добрай якасці і крыху танней, чым у магазіне. Я высветліў: тавар ён оптам купляе ў Бранскай вобласці. Народ вельмі задаволены. І цэнамі, і асартыментам, і самім прадаўцом. Ён робіць вельмі простую справу: спалучае тавар і пакупніка. Запаўняе пусты сегмент рынка. Уступае ў канкурэнтную барацьбу. І перамагае ў ёй. А пакупніку ідэалагічныя забабоны — да лямпачкі. Калі ў дзяржаўным гандлі даражэй, то ён ідзе да абэпаўца.

Каля галоўнай гандлёвай кропкі пасёлка прыстроіўся прычэп. Там можна купіць рыбу, сасіскі, курэй і шмат чаго яшчэ. Тут таксама пастаянная чарга. А ў гастраноме чэргаў няма. І прадаўцы пачынаюць бубнець: адбіваюць пакупніка! Правільна. Адбіваюць. Прыемна гэта чуць. Бо гэта і ёсць пачатак нармальнай эканомікі: канкурэнцыя. Штука, канешне, жорсткая, але справядлівая — перамагае мацнейшы і хітрэйшы. Вось ён і перамог. Без лішняга шуму і пылу. Пан прыватнік.

Атрымліваецца, што б ні рабіў наш зацыклены на сацыяльнай справядлівасці прэзідэнт, разумны сэнс бярэ сваё. Жыццё развіваецца па свайму сцэнару. Людзі стараюцца зрабіць яго зручным самі. Прадпрымальнік, які жадае "падняцца", і пакупнік, які жадае, каб танней і больш.

Андрэй СЯРЖАН.
Добрушскі раён.

НУ И НУ!

ЗА СВАДЕБНЫМ ПОДАРКОМ – В СУД

В 1982 году я решил застраховать свою внучку. Согласно договору, обязался в течение 16 лет платить Госстраху 5 руб. 10 коп. ежемесячно. Взамен было обещано и документально подтверждено, что после марта 1998 года, если она вступит в зарегистрированный брак, получит немалую по тем временам сумму — 1000 рублей.

Добровольная связь с Госстрахом длилась 11 лет и совершенно неожиданно прервалась в апреле 1993 года. Страховой агент, приходившая за взносами ко мне домой последние четыре года, перестала это делать, а администрация страховой инспекции, куда я неоднократно обращался для выяснения причин непринятия от меня денег, утверждала, что внесенные мной деньги не пропадут, а в отношении принятия взносов она ждет указаний руководства...

Еще 13 марта 1992 года правительство Республики Беларусь подписало Соглашение "О принципах и механизме обслуживания внутреннего долга бывшего СССР". К этому долгу была отнесена задолженность и по долгосрочным договорам страхования.

Конституция Республики Беларусь не осталась в стороне в вопросах признания и возврата государством своих долгов. В ст.44 говорится: "Государство поощряет и охраняет сбережения граждан, создает гарантии возврата вкладов...". 21 апреля 1998 года подписан Указ президента Республики Беларусь №229 "О компенсации обесценения вкладов и облигаций целевого беспроцентного займа 1990 года на приобретение товаров длительного пользования (ценных бумаг)".

Надо полагать, что для владельцев ценных бумаг, не вошедших в Указ №229, в частности, для граждан, заключивших долгосрочные страховые договоры, действуют условия, оговоренные при их заключении. Такого же мнения придерживается заместитель генерального директора Белгосстраха П.Суконкин, который в письме от 19.10.1999 г. (№06-01-07/2064) сообщал: "...страховая организация как одна из сторон договора обязана выплатить по истечении срока страхования страховую сумму, обусловленную данным договором страхования...". Со следующей мыслью г-на Суконкина согласиться трудно — он утверждает, что "принимаемые правительством Республики Беларусь, а также непосредственно Белгосстрахом меры по защите накоплений граждан в форме долгосрочных договоров страхования помогли в определенной степени компенсировать эти суммы...".

